Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 ЛІПЕНЯ 2016 г. СУБОТА № 141 (28251)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Тактычная медыцына: каб выратаваць**
СТАР. 4–5



**Тэатр… за кратамі**
СТАР. 9



**Лётчык, абраны Богам**
СТАР. 10–11

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Леанід МАЛЬЦАЎ, старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта:**

*«Наша ведамства павінна стварыць спрыяльныя ўмовы для жыхароў памежжа, але грамадзяне пры гэтым павінны ведаць і беззаганна выконваць заканадаўства аб дзяржаўнай мяжы. Пастаянна праводзім гарачыя лініі, і ўсе пытанні, якія паступаюць з месцаў, вырашаюцца. Бяспека мяжы — гэта важная частка нацыянальнай бяспекі, а значыць, і бяспекі кожнага грамадзяніна краіны. Усвядоміўшы гэта, грамадзяне самі будуць выконваць палажэнні заканадаўства і паведамляць памежнікам аб падазроных асобах і фактах супрацьпраўнай дзейнасці ў памежжы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.07.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9850 | ▲ |
| Еўра | 2,1887 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0307 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0800 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# «Агнявая» гатоўнасць



Фота БЕЛТА.

Дзень пажарнай службы адзначылі ў Брэсце 21 ліпеня. Святкаванне пачалося з праходжання параднага разліку Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС, пасля чаго на ўваходзе ў сквер плошчы Свабоды адбылося ўрачыстае адкрыццё Лавачкі пажарнага. Была арганізавана выстава пажарнай аварыйна-выратавальнай тэхнікі.

■ Роўныя магчымасці

## НУМАРЫ ДЛЯ КАЛЯСАЧНІКАЎ І ПАНДУСЫ Ў ШКОЛАХ

### За парушэнне нормаў безбар'ернага асяроддзя будуць прыцягваць да адказнасці

**З такой прапановай выступіла намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА. «Няхай заказчыкі выпраўляюць парушэнні за грошы з уласнай кішэні. Трэба не прымаць такія аб'екты. Павінны быць самыя жорсткія падыходы, я вельмі прашу звярнуць на гэта ўвагу», — выказалася віцэ-прэм'ер падчас выязнога пасяджэння Рэспубліканскага міжведамаснага савета па праблемах інвалідаў.**

Пытанням безбар'ернага асяроддзя цяпер надаецца шмат увагі. Толькі ў Мінскай вобласці ўдзельная вага адаптаваных аб'ектаў вырасла з 53 працэнтаў у 2011 годзе да 86 працэнтаў у 2015-м. Умовы для беспераШкоднага доступу інвалідаў створаны ў 1659 будынках.

СТАР. 3



Фота БЕЛТА.

■ Акцэнт на здароўе

## У НАС НЕ КУРАЦЬ

### Большасць людзей падтрымлівае меры па забароне згубнай звычкі



**Поўную забарону курэння ў грамадскіх месцах падтрымлівае тры чвэрці дарослага гарадскога насельніцтва. Гэта паказваюць вынікі даследавання аб стаўленні жыхароў Беларусі да захадаў, скіраваных на скарачэнне спажывання тытуню. Па ініцыятыве Беларускага таварыства абароны спажыўцоў і Міжнароднай канфедэрацыі таварыстваў спажыўцоў даследаванне ў маі-чэрвені правялі спецыялісты Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій Белдзяржуніверсітэта. Апытанне праводзілася ва ўсіх абласцях і Мінску сярод тых, каму ад 18-ці.**

Як высветлілася, кураць у краіне 35 працэнтаў дарослага гарадскога насельніцтва. Амаль палова беларускіх мужчын і каля 25 працэнтаў жанчын з'яўляюцца курцамі. Сярод мужчын ні разу не спрабавалі курыць усяго 19 працэнтаў. Максімальная колькасць асоб з такой залежнасцю назіраецца сярод самых актыўных і працаздольных груп насельніцтва дзетароднага ўзросту: 18-24 гады (42 працэнты) і 25-39 (38 працэнтаў). Мужчына-курэц выкурвае ў сярэднім тры чвэрці пачка ў дзень, а жанчына — палову. Ва ўзроставай групе 24-39 гадоў кожны трэці курэц штодня выкурвае пачак і болей цыгарэт штодня.

— Забарона на курэнне ў грамадскіх месцах з'яўляецца адной з найбольш эфектыўных мер па зніжэнні спажывання цыгарэт, прадугледжаных Рамачнай канвенцыяй па барацьбе супраць тытуню Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, — тлумачыць **старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна СУША.** — Як паказала даследаванне, захады па абмежаванні месцаў, дзе можна курыць, успрымаюцца беларусамі станоўча. Поўную забарону курэння падтрымліваюць, у сярэднім, 75 працэнтаў насельніцтва, па асобных відах падтрымка яшчэ больш значная.

СТАР. 6